**Урок 8. Гукі мовы. Выдзяленне гука ў слове**

**Мэта:** забяспечыць засваенне паняцця “гук мовы”, асваенне спосабу вызначэння гука ў слове, фарміраванне ўмення адрозніваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць.

1. **Паведамленне тэмы і мэт урока**

**-** Сення мы пачынаем новае падарожжа па краіне беларускай мовы. Нас чакаюць новыя астравы і новыя адкрыцці. Для наступных ўрокаў нам будуць патрэбныя ўвага, чуйны слых, жаданне пазнаць новыя таямніцы беларускай мовы і гатоўнасць адзін аднаму дапамагаць. Вы гатовыя да атрымання новых ведаў?

2. **Фарміраванне ўяўленняў пра гукі мовы як “будаўнічы матэрыял” слова, якое чалавек вымаўляе.**

   **Эўрыстычная гутарка пра гукі мовы як будаўнічы матэрыял.**

**Этап 1.** Назіранне “З чаго зроблены прадметы навакольнага свету?”.

- Разгледзьце вакол сябе прадметы і назавіце матэрыял, з якога яны зроблены.

**Этап 2.** Пастаноўка праблемнага пытання “З чаго складаецца слова”.

- Разгарніце буквар на с.18, праглядзіце верхні рад малюнкаў.
- Хто здагадаўся, якую праблему нам трэба будзе вырашыць на ўроку, на якое пытанне трэба знайсці адказ? Якая схема намалявана ў рамцы? Значыць, трэба вызначыць матэрыял, з якога што зраблена? (слова)
- Усе прадметы навакольнага свету з чагосьці складаюцца, а з чаго складаюцца словы, з якога матэрыялу яны зроблены? Будзем шукаць адказ на гэтае пытанне. Пра галоўнае пытанне ўрока будуць нагадваць схема ў буквары з умоўным знакам “Праблема”.
- Хто можа сам паўтарыць пытанне?А хто можа адразу адказаць на яго?
- З літар зроблны напісаныя словы. А словы, якія мы вымаўляем зроблены з чагосьці іншага. Падумаце, ці можна слова пабудаваць без літар? Хіба слова не можа існаваць без літар?

**Этап 3. Падвядзенне да вывадаў.** 1) можна не ведаць літар, але ўмець размаўляць, спяваць; 2) словы, якія мы вымаўляем,складаюцца з гукаў.

**-** Словы ў вусным маўленні мы выкарыстоўваем, калі гутарым з сябрамі, калі скажа першае слова дзіця, калі спяваем песню разам. Сябры размаўляюць адзін з адным, не выкарыстоўваючы літар. Маленькае дзіця літар не ведае, але гэта не перашкадже яму правільна называць патрэбныя прадметы. Нават словы песні ці верша можна вывучыць, калі не ведаеш літар ці не ўмееш чытаць!

**-** Літар можа не быць, а слова ўсе роўна нсць, мы яго вымаўляем. З чаго ж складаееца слова, якое мы вымаўляем?

Словы, якія мы вымаўляем складаюцца з гукаў.

**Этап 4. Падвядзенне да вываду “Слова складаецца не з любых гукаў, а з гукаў мовы”**

Ваша задача – знайсці гукі, з якіх будуюцца словы. Паслухайце розныя гукі: птушыныя спевы, звон званочка, шамаценне паперы, стук алоўка.

- Гэта гук? Ці можна з гэтых гукаў пабудаваць слова?

- Прагледзіце малюнкі на с.18. Якія гукі ўтварвюць прадметы, жывелы і з’явы

прыроды?
- Ці можна з гэтых гукаў пабудаваць словы? (не) Якія гукі патрэбны для будаўніцтва слова? (гукі, якія вымаўляе чалавек)
**Этап 5. Пошук адказу на пытанне "Як атрымліваюцца гукі маўлення чалавека?"**
- Падумайце, што прымушае прадметы ўтвараць гук? Трамвай ідзе па рэйсах – чуецца шум. Машына шуміць, калі працуе матор. Заўседы есць работнік!
- Разгледзьце ніжнія малюнкі с.18 буквара. Што прымушае гадзіннік цікаць? Піяніна іграць?
- Разгледзьце трэці малюнак с.18. Што працуе, калі людзі размаўляюць? Давайце хорам вымавім словы: мама, сябар, школа.
- Гукі мовы ўзнікаюць тады, калі працуюць органы маўлення чалавека: язык, вусны, зубы, галасавыя звязкі.
- Паглядзіце як па рознамі рухаюцца мае вусны, язык, зубы, калі я гавару розныя гукі.
**Падагульненне.**
**-** Раскажыце ўсе, што вы даведаліся пра словы і гукі.
Словы, якія чалавек вымаўляе, складаюцца з гукаў. Словы складаюцца не з любых гукаў, а з гукаў мовы чалавека. Гук мовы – гэта "матэрыял", з якога будуюцца словы. Гукі атрымліваюцца, калі працуюць органы маўлення (рот).
**Пастаноўка новай вучэбна-практычнай задачы.**
- Ці знайшлі вучні адказ на пытанне, якое было пастаўлена ў пачатку ўрока? Першае важнае адкрыцце вы ўжо зрабілі. Вы даведаліся, што словы складаюцца з гукаў мовы чалавека.
Наша мэта – даведацца пра самыя галоўныя сакрэты гукаў, іх уласцівасці, асаблівасці. Усе гатовыя да новых адкрыццяў? Будзьце ўважлівыя.

3. **Знаемства з асноўнымі ўласцівасцямі гукаў.**
   **Гульня "Чуйныя вушкі"** – Будзем вучыцца слухаць, чуць і вымаўляць гукі мовы. Праверым, у каго самыя чуйныя, уважлівыя вушкі! Я буду гаварыць ціха, будзьце ўважлівыя. Паўтарайце за мной. (р, а, н, о, л)

**-** Закрыйце адно вуха. (гульня працягваецца) Закрыйце другое вуха.
Гукі мовы нельга ўбачыць, гукі мы чуем і вымаўляем.
- Мы з вамі абавязкова пазнаемімся з усімі сакрэтамі гукаў, калі будзем выконваць на ўроках адно важнае правіла: "Каб пра гук нешта даведацца, трэба з ім папрацаваць – вымавіць, паслухаць".
**Пастаноўка праблемнага пытання.**
- Як вы думаеце, ці легка вызначыць з якіх гукаў складаецца слова і колькі ў ім гукаў? Зараз праверым. Працаваць будзем у групах. Знайдзіце ў буквары значок. Побач размешчана заданне. Паглядзіце на малюнак. Якім словам называецца гэты прадмет?
- Ваша задача – вызначыць, колькі ўсяго гукаў у слове яблык. Усе гукі слова рассыпаны, трэба навесці парадак.
- Варыянты былі розныя, а правільнага адказу няма. Хтосьці зможа назваць першы гук слова? (й)

А вы можаце вызначыць пяты гук слова? Хто ўмее лічыць да пяці? Тады палічыце гукі слова і назавіце пяты гук. (ы)
- Аказваецца з гукамі працаваць не так проста! Хочаце навучыцца вызначаць у любым слове колькасць гукаў і правільна іх называць? Калі будзеце ўважлівыя, у вас усе атрымаецца! Вы ж прыйшлі ў школу вучыцца!
**4. Увядзенне спосабу выдзялення гука ў слове.** Разгледзьце малюнкі на с.19.
*Алгарытм працы з гукамі.*
*1. Настаўнік задае ўзор правільнага вымаўлення – выразна вымаўляе слова або асобны гук з мэтавай устаноўкай:* - Паслухайце, як гучыць слова (як вымаўляецца гук)
*2. Вучні хорам паўтараюць некалькі разоў, каб зафіксаваць на слых патрэбнае вымаўленне, настаўнік гаворыць:* - Давайце ўсе разам хорам выразна вымавім слова (гук).
3. Вучні ўслых самастойна (кожны сам сабе) вымаўляюць слова або асобны гук. Устаноўка настаўніка: - Цяпер паспрабуйце самі вымавіць слова, гук. Паслухае, як яно (ен) гучыць.
**Знаемства з графічным абазначэннем колькасці гукаў у слове.**
- Разгледзьце малюнкі і назавіце словамі прадметы. Пад кожным малюнкам есць схемы слоў. Гэта нашы памочнікі. Кожны квадрат – гэта домік аднаго гука. Колькі квадратаў на схеме слова сыр? Колькі ўсяго домікаў для гукаў? Значыць, колькі гукаў у гэтым слове?
**Увядзенне прыему працяжнага вымаўлення гука ў слове.**
- Будзем усе разам вучыцца выдзяляць гукі ў слове. Я буду паказваць, як трэба працаваць з гукам. Самы галоўны сакрэт – каб не згубіць гукі, іх трэба голасам працягваць у слове адзін за адным. Слова трэба кожны раз вымаўляць да канца, цалкам. Паслухайце, як я буду цягнуць у слове першы гук – (ссссссыр). Спрабуем усе разам. Цягніце хорам са мной. Цяпер кожны сам услых вымавіць слова і паслухае, які першы гук. Цягніце і слухайце першы гук. Які першы гук? Абазначце яго фішкай на схеме.
- Шукаем другі гук у слове сыр. Першы гук (С) мы ўжо ведаем, вымавім яго ў слове коратка, а наступны гук будзем цягнуць і слухаць. Вось так – (сыыыыр). Цягніце хорам са мной. Цяпер кожны сам вымавіць слова ўслых і паслухае, які гук цягнецца. Цягніце і слухайце другі гук у слове.Які гук пачулі другім у слове? Абазначым яго фішкай на схеме. Усе гукі знайшлі? Праверым. Я паказваю на фішкі ў доміках, а вы вымаўляеце гукі. Колькі засталося домікаў?
- Вымаўляем слова яшчэ раз: першыя гукі вымаўляем коратка, а апошні гук будзем цягнуць і слухаць, вось так – (сырpppp). Цяпер кожны сам вымавіць слова ўслых і паслухае, які гук цягнецца. Цягніце і слухайце апошні гук. Абазначым яго фішкай на схеме. Усе гукі знайшлі? Праверым. Я паказваю на фішкі ў доміках, а вы вымаўляйце гукі. Усе домікі занятыя?
- Праверым схему, складзеную на парце. Які першы гук? Падыміце фішку і вымавіце гук.. Пакладзіце на месца фішку. Які другі гук? І г.д.

- Зараз вазьміце аловак і вядзіце, як я, уздоўж фішак і вымаўляйце гук за гукам. Атрымалася слова? Значыць, мы навучыліся выдзяляць гукі ў слове! Малайчыны, вы вельмі стараліся.
- Цяпер будзем прыбіраць фішкі. Прыбярыце ў бок фішку, якая абазначае гук (р). У якім доміку жыве гэты гук? Значыць, трэба прыбраць фішку з апошняй клеткі. Якая частка слова засталася на схеме? Цяпер прыбярыце фішку, якой мы абазначалі гук (ы). Які гук застаўся?

**Рэфлексіўны аналіз спосабу дзеяння.**

- У нас з вамі ўсе атрымалася – мы правільна вызначылі ў слове ўсе гукі, не дапусцілі памылак. А як мы дзейнічалі? Давайце паўторым усю паслядоўнасць дзеянняў, каб і потым гэтак жа працаваць з гукамі. Схема дапаможа нам успомніць, як мы працавалі з гукамі слова.
- Паглядзіце на першы рад клетак.У кожным доміку схемы пытанні – гэта заданне, якое мы выконвалі: даведаліся, з якіх гукаў складаецца слова, якія гкі жывуць у гэтых доміках. Калі мы атрымалі заданне, мы вымавілі слова ўслых, каб з ім пазнаеміцца. Так трэба паступаць заўжды – спачатку паслухаць ўсе слова ўслых, з якім будзем працаваць.
- Наступны радок нагадвае, як мы шукалі гукі слова. З чаго мы пачыналі? Як мы з вамі дзейнічалі? Як працавалі з гукам? Наш першы крок – гэта першая каляровая клетка. Стрэлка ў гэтай клетцы паказвае, што мы цягнулі ў слове першы гук, каб яго пачуць.
- Што рабілі далей? Хто можа расказаць? Наш наступны крок – гэта другая каляровая клетка. Стрэлка ў другой клетцы паказвае, што мы цягнулі ў слове другі гук, каб яго пачуць.
-*Так жа і з трэцім складом.*
- А што мы рабілі у канцы? (правяралі, ці ўсе гукі мы вылучылі) Як мы правяралі? Хто запомніў і можа расказаць? Чаму ўсе клеткі выдзелены колерам і праз усе клетачкі праходзіць стрэлка? Нам трэба было пачуць усе гукі слова і праверыць іх месца з доміку. Гэта схема і далей будзе дапамагаць нам правільна працаваць з гукамі.

**Практычная работа па выкарыстанні спосабу дзеяння.** Гукавы аналіз слоў мыш, шар і руль. Работа арганізуецца па аналогіі з гукавым аналізам слова сыр.

**Фіксацыя агульнага посабу дзеяння з гукамі.** Па апорнай схеме ўнізе (с.19) раскажыце, як трэба працаваць з гукамі, каб даведацца пра іх сакрэты. (паслухай – прагавары-зрабі)

4. **Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

Што вы даведаліся? Што навучыліся самі рабіць?